*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна

№ 24 (369) | Серада, 24 чэрвеня 1959 года | Цана 20 кап.

*Чытай сёння*

Матэрыялы аб завочным навучанні

⊙ Больш патрабаванняў і больш дапамогі — 1 стр.
⊙ Ад кафедраў залежыць многае — 2 стр.
⊙ Кантрольныя ці самакантрольныя работы — 2 стр.
⊙ Прадоўжыць пачатую работу — 3 стр.
⊙ Гэта таксама подзвіг — 3 стр.
⊙ Захапляюча, цікава... — 4 стр.
⊙ Завочнікам патрэбна спецыфічная кніга — 4 стр.



На здымку: студэнты-завочнікі — атрымліваюць літаратуру ў бібліятэцы ўніверсітэта.

## Больш патрабаванняў і больш дапамогі

З ГОДУ Ў ГОД расце ў нашым універсітэце кантынгент студэнтаў-завочнікаў. За пасляваенныя гады ён павялічыўся амаль у 6 разоў і цяпер на завочным факультэце вучыцца 3116 чалавек. Толькі ў 1958 годзе на першы курс было залічана каля 600 чалавек. Столькі ж будзе прынята і ў гэтым годзе. На завочным факультэце ўніверсітэта адкрываецца новае аддзяленне—аддзяленне філасофіі. У сувязі з гэтым перад намі паўстаюць адказныя задачы па карэннаму паляпшэнню арганізацыі вучэбнага працэсу і аказанню дапамогі студэнтам у іх самастойнай рабоце ў час сесій і асабліва ў межсесійны перыяд.

У гэтых адносінах за апошні час праведзена некаторая работа. Пытанні завочнай падрыхтоўкі студэнтаў сістэматычна абмяркоўваюцца на Вучоных саветах факультэтаў і ўніверсітэта, на рэктараце і на вытворчых нарадах выкладчыкаў. Больш увагі завочнаму факультэту сталі ўдзяляць кафедры.

Аднак у падрыхтоўцы спецыялістаў на завочным факультэце ёсць яшчэ шэраг сур'ёзных недахопаў.

Перш за ўсё неабходна павысіць патрабаванні да ведання праграмнага матэрыяла студэнтамі-завочнікамі, асабліва ў перыяд здачы экзаменаў. Закончыўшыя завочны факультэт атрымліваюць тыя ж правы, што і выпускнікі стацыянара. Няправы тыя выкладчыкі, якія лічаць, што нельга да завочніка прад'яўляць тыя ж патрабаванні, як да студэнта стацыянара, што завочніку трэба рабіць скідку, улічваючы яго загружанасць работай, сямейнае становішча і г. д. Не трэба баяцца часовага зніжэння лічбавых паказчыкаў па паспяховасці ў імя паляпшэння падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Вырашыць задачу павышэння якасці падрыхтоўкі нельга аднабакова, толькі за лік узмацнення патрабавальнасці. Гэта неабходная мера, але спыняцца на ёй нельга. Паўсядзённае павышэнне патрабавальнасці павінна спалучацца з такой жа паўсядзённай, разнабаковай і ўдумлівай работай па ўзмацненню дапамогі студэнтам. Відавочна, што сюды ўваходзіць і планаванне, і арганізацыя экзаменацыйных сесій, павышэнне ідэйна-тэарэтычнага і метадычнага ўзроўню лекцый, практычных заняткаў і кансультацый і рэгулярнае забеспячэнне завочнікаў неабходнай літаратурай, праграмамі, падручнікамі і метадычнымі дапаможнікамі.

Завочнае навучанне ва ўніверсітэце яшчэ не стала арганічнай часткай агульнай работы кафедраў, хаця некаторыя зрухі ў гэтай справе і ёсць. Кафедры ўсё яшчэ недастаткова ўдзельнічаюць у арганізацыі вучэбнага працэсу на завочным факультэце, недастаткова ажыццяўляюць кантроль за якасцю чытання лекцый, правядзення практычных і семінарскіх заняткаў. Большасць кафедраў на сваіх пасяджэннях не заслухоўваюць справаздачы выкладчыкаў аб рабоце са студэнтамі-завочнікамі, вельмі рэдка абмяркоўваюць пытанні, звязанныя з вучэбна-метадычнай работай, а таксама пытанні аб падрыхтоўцы і правядзенні вучэбна-экзаменацыйных сесій, вынікі сесій.

Вялікім недахопам у рабоце завочнага факультэта з'яўляецца цякучасць выкладчыцкага складу. Між тым, пры правядзенні заняткаў з завочнікамі трэба ўлічваць асаблівасці арганізацыі вучэбнага працэсу на завочным факультэце.

Самастойныя заняткі студэнтаў-завочнікаў у межсесійны перыяд складаюць аснову завочнай адукацыі. 70—80 працэнтаў вучэбнага часу прыходзіцца на гэты перыяд. Поспех лабараторна-экзаменацыйнай сесіі залежыць ад самастойнай работы студэнтаў у межсесійны перыяд, залежыць ад таго, як яны працуюць дома над своечасовым і якасным выкананнем плана. А між тым з году ў год адным з карэнных недахопаў работы кафедраў універсітэта з'яўляецца нездавальняючая арганізацыя і кіраўніцтва імі міжсесійнай самастойнай работай студэнтаў-завочнікаў. Некаторыя кафедры лічаць, што іх справа «правесці» толькі сесію, а арганізацыяй самастойнай работы завочніка пасля сесіі кафедры не займаюцца. Міжсесійная работа студэнтаў-завочнікаў арганізуецца і праводзіцца без накіроўваючай ролі кафедраў. Маюць месца выпадкі нясвоечасовага і павярхоўнага рэцэнзавання кантрольных і курсавых работ студэнтаў. На асобных кафедрах з вялікім спазненнем абмяркоўвалася і зацвярджалася іх тэматыка. Кафедры недастаткова ўвагі ўдзяляюць студэнтам пры напісанні дыпломных работ, не кантралююць ход іх напісання.

Усё яшчэ нездавальняюча пастаўлена работа па напісанню і выданню метадычных распрацовак, пісьмовых лекцый і метадычных дапаможнікаў для студэнтаў-завочнікаў. Як правіла, кафедры не праводзяць абмеркаванне якасці кантрольных і курсавых работ студэнтаў і рэцэнзій на пісьмовыя работы. Дрэнна і з пісьмовымі кансультацыямі.

Каб палепшыць работу са студэнтамі-завочнікамі ў міжсесійны перыяд, трэба арганізаваць выезды выкладчыкаў у раёны рэспублікі для чытання лекцый і правядзення кансультацый са студэнтамі. Не перашкодзіць наладзіць больш цесную сувязь з арганізацыямі і ўстановамі, у якіх працуюць студэнты, сістэматычна інфармаваць гэтыя арганізацыі аб вучобе і дысцыпліне студэнтаў. Дарэчы, варта было б уключыць у план навукова-даследчай работы кафедраў распрацоўку і напісанне лекцый, вучэбных дапаможнікаў і навукова-метадычных распрацовак для студэнтаў-завочнікаў. Побач з метадычнымі ўказаннямі па асобных дысцыплінах вучэбнага плана практыкаваць распрацоўку агульных метадычных указанняў аб самастойнай рабоце студэнтаў-завочнікаў над літаратурай, аб падрыхтоўцы да экзаменаў, аб выкананні пісьмовых работ.

На гэтых асноўных пытаннях і павінна быць сканцэнтравана ўся ўвага выкладчыцкага складу і кафедраў універсітэта. Мы не павінны забывацца на тое, што ў 1965 годзе ў нас будзе навучацца 4 500 завочнікаў.

У. Р. ІВАШЫН,
дэкан завочнага факультэта.

*Рэпартаж*

## СУСТРАКАЮЦЦА ТАК СЯБРЫ...

ЯК ТОЛЬКІ аўтобус з польскімі сябрамі прыпыніўся ля біякорпуса, яго шчыльным кальцом абступілі сустракаўшыя. Моцныя поціскі рук, словы прывітання—і ўсе разам накіроўваюцца ў кабінет рэктара ўніверсітэта, акадэміка АН БССР А. Н. Сеўчанкі. Ярош Мачышэўскі, кіраўнік дэлегацыі, сакратар ЦК Саюза сацыялістычнай моладзі Польшы, прадстаўляе прысутным сваіх калег і пачынаецца шчырая задушэўная размова. Польскіх сяброў цікавіць літаральна ўсё: гісторыя ўзнікнення ўніверсітэта, гісторыя развіцця беларускай народнай асветы наогул. задаюцца пытанні і аб тым, якую выхаваўчую работу сярод студэнтаў вядзе рэктарат, дэканаты; якая сярэдняя паспяховасць па ўніверсітэту і ці ёсць розніца паміж паспяховасцю на факультэтах гуманітарных і дакладных навук; якія дысцыплінарныя меры могуць быць ужыты адносна непаспяваючых і недысцыплінаваных студэнтаў.



Інтэрв'ю дае рэктар А. Н. Сеўчанка

Нашы госці—актывісты Саюза сацыялістычнай моладзі Польшы і Саюза польскіх студэнтаў. Апошняя арганізацыя адыгрывае там ролю нашага прафсаюза. У гутарцы высвятляецца, што ўсе яны—студэнты пятых курсаў ці асістэнты, якія толькі што закончылі ВНУ краіны.

—Ну што ж,—усміхаючыся гаворыць Антон Нікіфаравіч Сеўчанка,—на развітанне жадаю вам у будучым усім стаць прафесарамі.

— А мы і збіраемся,—жартам адказвае Ярош Мачышэўскі.—Падобна таму, як Напалеон сказаў, што ў ранцы кожнага салдата ляжыць маршальскі жэзл, так і нас у кішэнях ляжаць прафесарскія мантыі.

Госці дзякуюць рэктару за гутарку і накіроўваюцца ў камітэт камсамола. Цяпер «у цяжкім становішчы» апынуўся Іван Сяргееў. Яго так і засыпаюць пытаннямі, толькі паспявай адказваць! Аднаго з польскіх таварышоў цікавяць арганізацыйныя бакі работы камсамола, другога—пастаноўка агітацыі і прапаганды, трэцяга—узаемаадносіны з прафсаюзам.

— Скажыце, калі ласка,—гаворыць адзін з гасцей,—і вы, і мы імкнемся выхоўваць усебакова адукаваных людзей. У прыватнасці, многа гаворыцца аб тым, што тэхнікам трэба даваць пэўныя веды па літаратуры, музыцы, жывапісу, наогул эстэтыцы. А літаратарам, гісторыкам, юрыстам ці даюцца ў вас якія небудзь веды па тэхніцы? Як, у якіх формах гэта робіцца?

Усе ўважліва слухаюць адказ, занатоўваюць яго ў запісныя кніжачкі. У гэты дзень сакратару камітэта камсамола давялося гаварыць і аб самадзейнасці, і аб спорце, і аб рабоце клуба, і аб тым, як камітэт камсамола арганізуе грамадска-карысную працу студэнтаў. Высвятляюцца агульныя і розныя метады работы, агульныя праблемы выхавання моладзі.

— Вось і нам, — гаворыць Янош Мачышэўскі,—лёгка ўзняць студэнтаў на будаўніцтва Новай Гуты ці Тых. А возьмем такі прыклад. Вось стаіць грамадскае крэсла з паламанай ножкай. Адрамантаваць яго—пару хвілін. Студэнт жа спакойна праходзіць міма. Ён лічыць, хіба ж гэта рамантычна—рамантаваць крэсла, хіба ж гэта важна для сацыялізма.

Размова зацягваецца настолькі, што ў гасцей не засталося часу аглядзець біякорпус. На пяць гадзін вечара была прызначана сустрэча са студэнтамі філфака.

(Працяг на стар. 2).



Польскія госці ў камітэце камсамола

☆

Гэта Фаіна Ціханаўна Карабут, старшы бухгалтар стыпендыяльнага разліковага стала нашай бухгалтэрыі. На сваім скромным пасту, яна працуе чотка, дакладна. Яшчэ ні разу Фаіна Ціханаўна не спазнілася з падрыхтоўкай дакументацыі на выплату стыпендыі.

☆



*Рэпартаж*

# СУСТРАКАЮЦЦА ТАК СЯБРЫ...

(Працяг. Пачатак на стр. 1)

У дэканаце польскія таварышы пацікавіліся, каго рыхтуе факультэт, тэматыкай дыпломных работ і кандыдацкіх дысертацый. Але бадай што самая цёплая і шчырая размова адбылася ў час сустрэчы са студэнтамі. Са словамі прывітання звярнуліся да гасцей Ніна Лук'янцава, Іван Старавойтаў, Эльжбета Зубрыцкая.

— Я рада вітаць вас,—на польскай мове гаварыла яна,—у краіне, якая стала для мяне другой радзімай. Тут я сустрэла шчырых, адданых сяброў, якія дапамаглі мне ў кароткі тэрмін авалодаць беларускай мовай. Спадзяюся, што вы адчуваеце сябе тут, як дома.

Са словам у адказ выступіў Ярош Мачышэўскі:

— Перш за ўсё мне хочацца ад ўсяго сэрца падзякаваць вам за тую незвычайную цеплыню, з якой нас усюды вось ужо другі дзень сустракаюць савецкія людзі.



Сваіх суайчыннікаў вітае Эльжбета Зубрыцкая.

Мы прыехалі сюды не толькі для таго, каб завязаць між моладдзю нашых краін новыя сяброўскія вузы братэрства, але і для таго, каб запазычыць ваш вопыт работы, таму што і ў нас, у Польшы, наспяваюць рэформы вышэйшай школы, і тут ваш вопыт нам дапаможа.

Нас цікавяць практычныя пытанні работы камсамола, мы распытвалі аб гэтым у ЦК ВЛКСМ, і ў вас ва універсітэце. Такія паўсядзённыя кантакты звязваюць нас моцнымі вузамі братэрства.

Наша дружба—глыбокая, працягваў Ярош Мачышэўскі, нас аб'ядноўвае адна барацьба за адзіны грамадскі лад. І ніхто не ўб'е кліна ў нашу дружбу!

Ярош Мачышэўскі расказаў таксама аб польскіх маладзёжных арганізацыях, аб развіцці сістэмы вышэйшай адукацыі ў Польшы, аб удзеле польскіх студэнтаў у грамадска-карыснай працы. Ён запэўніў, што ў асобе польскай моладзі савецкія юнакі і дзяўчаты маюць верных і выпрабаваных сяброў.

...Даўно закончылася афіцыйная частка, а ў кабінеце гісторыі КПСС, дзе адбывалася сустрэча, па ранейшаму было людна. Гутарка працягвалася. І хаця адны размаўлялі на недасканалай польскай мове, другія спрабавалі ўжываць беларускія словы, усё ж яны гаварылі на добра зразумелай адзін для аднаго мове—мове дружбы.



—Прабачце, але дазвольце задаць яшчэ адно пытанне,—гаворыць Ярош Мачышэўскі.

Тэкст і фота **А. ГАРЭЗНАГА.**

# *Ад кафедраў залежыць многае*

У АПОШНІЯ ГАДЫ кафедры універсітэта значна палепшылі сваю работу са студэнтамі завочнага факультэта. Кафедры замежнай літаратуры, палітэканоміі, тэорыі і гісторыі савецкага друку, гісторыі новага часу, алгебры і іншыя ўключыліся ў работу завочнага факультэта амаль ў поўным сваім складзе і чытаюць тыя ж курсы, што і на стацыянары. Значная частка кафедраў выдзяляе для работы з завочнікамі найбольш падрыхтаваных у тэарэтычных і метадычных адносінах выкладчыкаў, у тым ліку і прафесараў, зацвярджае тэматычныя планы, праграмы, экзаменацыйныя білеты, абмяркоўвае канспекты лекцый.

Некаторыя кафедры не абмяжоўваюцца гэтым, а выдаюць метадычныя пісьмы і ўказанні. Так метадычнае пісьмо па арганізацыі і правядзенню летняй палявой практыкі па геадэзіі было выдадзена кафедрай фізічнай геаграфіі.

Кафедрай замежнай літаратуры для студэнтаў-завочнікаў выдадзены тэмы кантрольных работ і метадычныя ўказанні да іх па курсу «Гісторыя замежных літаратур новага часу з 1871—па 1957 гг.». Прыкладна такога ж характару выдадзены метадычныя ўказанні па курсу «Асновы літаратуразнаўства» кафедрай рускай літаратуры.

Амаль усе кафедры своечасова даюць тэматыку дыпломных работ для студэнтаў-завочнікаў. Кіраўніцтва і рэцэнзаванне даручаюцца, як правіла, найбольш кваліфікаваным членам кафедраў. Дадатны факт—сувязь многіх дыпломных работ з практыкай.

Аднак у рабоце кафедраў універсітэта на завочным факультэце маюцца істотныя недахопы.

На асобных з іх усё яшчэ выдзяляюцца для работы завочнікамі менш кваліфікаваныя навуковыя супрацоўнікі. Так у склад кафедры беларускай мовы ўваходзяць прафесар Жыдовіч, чатыры дацэнты, кандыдаты навук і чатыры выкладчыкі без ступеняў і званняў. На завочным жа факультэце працуе толькі адзін кандыдат навук (т. Хацкевіч) і чатыры выкладчыкі без ступеняў і званняў. У складзе кафедры матэматычнага аналізу два вопытных дацэнты (т. т. Ламбін і Кауфман) і двое маладых выкладчыкаў (т. т. Рудакоўская і Наумовіч). На завочным факультэце працуюць толькі апошнія.

А хіба можна лічыць нармальным, што выдзелены кафедрай старажытнага свету кандыдат навук т. Мітрафанаў чытае на завочным факультэце тры розныя курсы: гісторыю першабытнага грамадства і асновы этнаграфіі, гісторыю Грэцыі і Рыма і асновы археалогіі.

Асобныя выкладчыкі празмерна перагружаны вучэбнай работай у перыяд экзаменацыйных сесій. Так выкладчыкі біяфака т. т. Кудрашова і Цераховіч штодзённа чытаюць па 10—12 гадзін, што, безумоўна, адмоўна адбіваецца на якасці іх работы.

Многія кафедры універсітэта не выкарыстоўваюць сваіх магчымасцей для выдання метадычнай літаратуры. Сюды адносяцца ўсе кафедры біялагічнага факультэта, кафедра ўгалоўнага права і працэсу і іншыя. Яны абмяжоўваюць сваю дзейнасць размеркаваннем вучэбных даручэнняў на завочным факультэце, зацвярджэннем тэматычных планаў і экзаменацыйных білетаў. Не абмяркоўваюцца канспекты лекцый, не арганізуецца ўзаеманаведванне лекцый, не выдаецца метадычная літаратура.

Парадаксальным фактам з'яўляецца тое, што загадчыкі кафедрамі не кантралююць работы сваіх падначальных, асабліва ў перыяд летняй экзаменацыйнай сесіі, якая праводзіцца якраз у той час, калі значная частка загадчыкаў кафедраў атрымлівае чарговы водпуск.

На асобных кафедрах нездавальняюча пастаўлена рэцэнзаванне кантрольных, курсавых і дыпломных работ студэнтаў-завочнікаў. Так, рэцэнзіі выкладчыкаў т. Шэўчэнкі (кафедра палітэканоміі), т. Кавалёвай (кафедра рускай мовы і агульнага мовазнаўства) з'яўляюцца вельмі кароткімі, на разгорнуты аналіз у іх няма і намёку.

Для больш паспяховай арганізацыі вучэбнага працэсу на завочным факультэце кафедрам універсітэта неабходна выдзяляць для работы з завочнікамі кваліфікаваных і вопытных навуковых работнікаў, а таксама абмяркоўваць на сваіх пасяджэннях канспекты лекцый, праводзіць у асобных выпадках стэнаграфічны запіс лекцый з далейшым іх абмеркаваннем, часцей ставіць і абмяркоўваць справаздачы членаў кафедры, якія працуюць на завочным факультэце. У мэтах палепшання якасці завочнага навучання кафедры павінны ажыццяўляць кантроль за рэцэнзаваннем навуковымі супрацоўнікамі кантрольных, курсавых і дыпломных работ.

У бліжэйшы ж час патрэбна пашырыць і палепшыць склад метадыстаў завочнага факультэта, удакладніць кола іх дзейнасці. Стварыць умовы для іх непасрэднай метадычнай работы, якая накіравана на палепшанне завочнага навучання. Усе гэтыя мерапрыемствы будуць, безумоўна, садзейнічаць далейшаму паляпшэнню работы завочнага факультэта. І многае тут, безумоўна, будзе залежыць ад работы кафедраў.

**Л. В. ШАШКОЎ, дацэнт.**

# Кантрольныя ці самакантрольныя работы?

В УЧОНЫ САВЕТ матэматычнага факультэта абмеркаваў пытанне аб шляхах паляпшэння завочнага навучання. У прыватнасці, разглядалася пытанне аб кантрольных работах, якія выконваюць студэнты-завочнікі.

Як вядома, у цяперашні час кантрольныя работы павінны абавязкова выконвацца, і па іх выстаўляюцца залікі. Потым праводзіцца экзамен па данаму прадмету, на якім звычайна не правяраецца, самастойна ці не была выканана кантрольная работа. Гэта прыводзіць да таго, што многія студэнты-завочнікі не працуюць самастойна на працягу ўсяго семестра, а механічна перапісваюць задачы, якія рашаюць другія, і пры праверцы не могуць растлумачыць, што напісана ў іх уласных сшытках.

Акадэмікі АН БССР, прафесары М. П. Еругін і У. І. Крылоў, а таксама дацэнт А. Х. Турэцкі лічаць, што работы павінны насіць характар **самакантрольных** работ. Калі рашэнні ўсіх задач з атрыманага кантрольнага задання ясны, то студэнт-завочнік не павінен абавязкова пасылаць яго выкананым ва універсітэт з мэтай атрымання заліка. Ён з'яўляецца на залік ці экзамен у перыяд сесіі і прадстаўляе экзаменатару сшытак з кантрольным заданнем і тут жа правяраюцца яго звычкі ў рашэнні тых ці іншых найбольш тыповых задач. Пры адсутнасці гэтых звычак ён атрымлівае незалік і не дапускаецца да экзамена.

Другія вучоныя, якія прысутнічалі на Вучоным савеце, не згадзіліся поўнасцю з выказанымі меркаваннямі.

«Тэарэтычна такія метады для павышэння ўзроўню ведаў добрыя, але да чаго прывядзе гэта практычна,—заўважыў доктар тэхнічных навук А. В. Іваноў.—Толькі да зніжэння паспяховасці». З гэтай заўвагай згадзіліся сакратар камсамольскага бюро матфака Варын, аспірант Я. Іваноў, кандыдат фізіка-матэматычных навук В. В. Ждановіч, кандыдат фізіка-матэматычных навук А. А. Гусак і іншыя.

Сапраўды, выказаныя раней прапановы разлічаны на высокую свядомасць студэнта-завочніка, на вялікае ўпорства яго ў працы. Аднак, многія з іх такімі якасцямі не валодаюць. Акрамя таго завочнік знаходзіцца ў спецыфічных умовах (работа на раёне, хатнія і грамадскія справы і інш.), якія пэўным чынам перашкаджаюць вучобе. Пры ўсім жаданні ён падчас не ў сілах выканаць кантрольныя заданні ва ўстаноўлены дэканатам тэрмін. Калі ж адмяніць зараз патрабаванне аб абавязковым выкананні і прадстаўленні ў пэўны тэрмін кантрольных работ, то не будзе стымула, і студэнты-завочнікі пад даўленнем абставін, адкладваючы самастойную работу над кантрольнымі заданнямі, могуць аказацца ў час сесіі зусім няздольнымі паказаць здавальняючыя веды.

Дэкан матфака прафесар Д. А. Супруненка падвёў вынікі спрэчак, пасля чаго было выпрацавана агульнае рашэнне.

Для павышэння ўзроўню ведаў студэнтаў-завочнікаў трэба трымацца кірунку—ад кантрольных работ да самакантрольных. Пераход трэба здзейсніць даволі паступова, на працягу 2—3 год, наступным шляхам: паколькі зараз дзейнічае палажэнне аб кантрольных работах, выкладчык у час сесіі, перш чым прымаць залік ці экзамен, павінен правяраць, наколькі самастойна выканана кантрольная работа. З цягам часу, калі студэнты-завочнікі пераканаюцца на ўласным вопыце, што фармальная прысылка сшыткаў з рашэннямі задач зусім не гарантуе ім паспяховай здачы заліка ці экзамена, толькі тады можна адмовіцца ад кантрольных і перайсці да самакантрольных работ: студэнт-завочнік, выконваючы такую работу, павінен сам пераканацца ў тым, што ён авалодваў тымі ці іншымі неабходнымі ведамі.

**А. П. РАБУШКА,**
**кандыдат фізіка-матэматычных навук.**

# Без выдатных адзнак

**Перад экзаменатарам звычайна ляжыць раскрытая заліковая кніжка студэнта. Як толькі той пачынае адказваць, ён запаўняе яе графы, пакідаючы чыстай толькі адну—графу, дзе павінна прастаўляцца адзнака. І вельмі часта здараецца, што выкладчык доўга вагаецца, перш чым паставіць у гэту графу адзнаку. Двойку неяк не падымаецца ставіць рука, асабліва студэнту-завочніку, а сумленне не дазваляе ставіць «здавальняюча»...**

**Іменна ў такім становішчы апынуўся Уладзімір Рыгоравіч Івашын, які прымаў экзамены па гісторыі нашай партыі ў студэнтаў-завочнікаў першага курса біялагічнага аддзялення.**

**Экзамен паказаў, што біёлагі на працягу года не працавалі сістэматычна над першакрыніцамі, яны не ведалі часам нават элементарных рэчаў. Зусім непадрыхтаваным прыйшоў на экзамен М. Лагута. Ён не змог адказаць нават на прасцейшыя пытанні. Здзівіў і Г. Сухаў. Адчуваецца, што гэты юнак здольны, эрудыраваны. І тым не менш ён не здолеў адказаць ні на адно пытанне білета. Стваралася ўражанне, што Сухаў прыйшоў на экзамен з тым запасам ведаў, які ў яго захаваўся пасля дзесяцігодкі.**

**Калі экзамен закончыўся, у экзаменацыйнай ведамасці не было пастаўлена ніводнай выдатнай адзнакі... З 47 здаваўшых 12 атрымалі двойкі. Гэта павінна паслужыць сур'ёзным урокам для першакурснікаў.** **А. ЗВЕРАЎ.**



На здымку: рыхтуецца да адказу Ала Дахоўкер. Толькі яна паказала трывалыя веды і крышачку не «дацягнула» да «выдатна»

# Прадоўжыць пачатую работу

Трэба адразу сказаць, што завочнаму навучанню на юрыдычным факультэце ў апошні час надаецца значна больш увагі, чым раней. Па большасці вучэбных дысцыплін кафедры адмовіліся ад выкарыстання заданняў, якія падрыхтаваў Усесаюзны завочны юрыдычны інстытут, даручыўшы іх складанне выкладчыкам, што вядуць адпаведныя вучэбныя курсы на завочным факультэце.

Большасць заданняў па курсавых і кантрольных работах, падрыхтаваных кафедрамі, прадстаўляюць сабой падрабязныя метадычныя распрацоўкі. У іх указваюцца не толькі тэмы работ і літаратура, але і даюцца каштоўныя метадычныя ўказанні студэнтам аб тым, як павінна быць выканана заданне, прыводзіцца прыкладны план пісьмовай работы па кожнай тэме. Такі характар маюць, напрыклад, «Заданні па курсу «Савецкае жыллёвае будаўніцтва» (курс па выбару), складзеныя дацэнтам В. Ф. Чыгірам, «Заданні па курсавых і кантрольных работах па савецкаму грамадзянскаму праву» для студэнтаў 3 курса, складзеныя дацэнтам К. А. Барзовай і кандыдатам юрыдычных навук Я. М. Якаўлевай і іншыя.

Не абмяжоўваючыся гэтым, кафедра грамадзянскага права і працэсу распрацавала спецыяльнае пісьмо па напісанню курсавых і кантрольных работ па савецкаму грамадзянскаму праву для студэнтаў юрыдычнага аддзялення завочнага факультэта (складальнікі К. А. Барзова і Я. М. Якаўлева). Кафедра ўгалоўнага права і працэсу падрыхтавала метадычнае пісьмо «Аб недахопах кантрольных работ па пракурорскаму нагляду».

Больш сур'ёзна сталі падыходзіць кафедры да падбору кадраў. Асноўная нагрузка на завочным аддзяленні выконваецца штатнымі работнікамі. Аднак, паколькі вучэбная нагрузка на стацыянары і на завочным аддзяленні намнога перавышаюць тую, што можа быць выканана па нарматывам, запрашаліся пачасавікі з ліку навуковых супрацоўнікаў АН БССР і вопытных практычных работнікаў. Большасць выкладчыкаў, якія працуюць на паўстаўцы ці пагадзіннай аплаце і запрошаны для арганізацыі вучэбнага працэсу на юрыдычным аддзяленні завочнага факультэта, маюць навуковыя ступені і званні (В. С. Карпік, А. А. Галоўка, В. А. Шкурко, М. М. Авакаў, С. Р. Дробязка, Д. Ф. Ерамееў і інш.). На юрыдычным аддзяленні працуюць кваліфікаваныя практычныя работнікі міністр юстыцыі БССР І. Д. Вятроў, член Вярхоўнага Суда БССР А. М. Хвастоў і іншыя. Пагадзіннікі запрашаліся толькі для рэцэнзавання часткі пісьмовых работ і кіраўніцтва часткай дыпломных работ. Пры гэтым значная частка і гэтай вучэбнай нагрузкі выконвалася штатнымі работнікамі.

Паляпшэнню работы кафедраў юрфака па арганізацыі завочнага навучання ў вядомай ступені садзейнічалі грамадскія арганізацыі факультэта. Так, на пасяджэнні партбюро факультэта пры абмеркаванні работы кафедры ўгалоўнага права і працэсу спецыяльна разглядалася пытанне аб удзеле кафедры ў арганізацыі работы завочнікаў. Было адзначана, што кафедра ў гэтым кірунку зрабіла вельмі мала. У канцы мінулага года па ініцыятыве прафбюро юрфака разам з дэканатам завочнага факультэта была праведзена вытворчая нарада ўсіх выкладчыкаў, якія працуюць на завочным аддзяленні юрыдычнага факультэта. Нарада акрэсліла шэраг канкрэтных мерапрыемстваў па ліквідацыі недахопаў у метадычнай рабоце кафедраў юрфака на завочным факультэце. 19 чэрвеня гэтага года пытанне аб завочным навучанні было абмеркавана на агульным прафсаюзным сходзе супрацоўнікаў факультэта.

Аднак завочнаму навучанню грамадскія арганізацыі і кафедры факультэта ўдзяляюць усё яшчэ недастатковую ўвагу. Кафедры слаба кантралююць якасць выкладання, не арганізавана ўзаеманаведванне лекцый і семінараў выкладчыкамі кафедраў, не абмяркоўваюцца тэксты лекцый, не зацвярджаюцца на пасяджэннях кафедраў тэматычныя планы лекцый і практычных заняткаў па большасці прадметаў.

І. С. ЦІШКЕВІЧ, дацэнт.

# Радкі з пісем

...Для нас асабліва востра стаіць пытанне з дапаможнікамі. Каб падрыхтаваць той ці іншы прадмет, патрэбна даступная літаратура. Гэта зразумела. Пры падрыхтоўцы самастойна ў сельскай мясцовасці ўзнікае шэраг няясных пытанняў. Аб усіх іх выкладчыку не напішаш. У бібліятэцы выдаюць, як правіла, тую літаратуру, якую выкладчыкі не раяць. Асабліва цяжка прыходзіцца пры напісанні кантрольных работ. Нярэдка іх перапісваем па 2—3 разы. Усяго гэтага можна было б пазбегнуць, калі б нам далі дапаможнікі, хаця б на ліпень і жнівень месяцы.

В. РАМАНЮК.

...Хацелася б, каб дэканат завочнага факультэта сістэматычна інфармаваў нас аб выходзячых з друку і ўжо маючыхся ў продажы падручніках і вучэбных дапаможніках з тым, каб мы маглі своечасова накіраваць на іх заказы ў арганізацыі, што гандлююць кнігай.

Г. СТАЎСКІ.

...Не раз і не два гаварылася аб тым, што з завочнікамі не праводзіцца ў перыяд сесіі ніякай палітыка-выхаваўчай работы. Размовы засталіся размовамі, а справа з месца не зрушылася. А між тым мы з задавальненнем паслухалі б лекцыю на навуковую ці палітычную тэму, сустрэліся б з наватарамі вытворчасці, работнікамі літаратуры і мастацтва. Бадай што ніхто б з нас не адмовіўся схадзіць з экскурсіяй на прадпрыемствы Мінска ці яго музеі.

А. ЗЯМЛЯНІКАЎ.

# Гэта таксама подзвіг



ЗАРАЗ, КАЛІ засталося здаць апошні дзяржаўны экзамен, міжволі ўспамінаюцца гады настойлівай, упартай вучобы, шматлікія залікі і экзамены, радасці і няўдачы,—усё тое, што засталося цяпер ззаду.

Некаторыя людзі, даведаўшыся аб тым, што Уладзімір Антонавіч Казак заканчвае універсітэт ва ўзросце 51 года, дзівяцца.

— І не цяжка вам было?—пытаюцца яны ва Уладзіміра Антонавіча.

— Не, ніколькі,—адказвае той, усміхаючыся.—Як гаворыць народная прымаўка, вучыцца і да 100 год не позна.

І сапраўды, Уладзімір Антонавіч Казак, студэнт 6 курса аддзялення біялогіі завочнага факультэта, вучыўся не баючыся цяжкасцей, не палохаючыся ніякіх перашкод. І вучыўся ні абы як, а добра, з поспехам.

Выдатным вынікам яго вучобы ў нашым універсітэце з'явілася яго дыпломная работа, якая носіць назву «Кравяносная сістэма органаў размнажэння і селязёнкі некаторых рыб ваколіц горада Вільнюса». Па аднадушнаму прызнанню навуковага кіраўніка кандыдата біялагічных навук Г. В. Гладкага, а таксама прафесара І. М. Сяржаніна дыпломная работа Уладзіміра Антонавіча Казака з'яўляецца адной з лепшых на факультэце, яна мае параўнальнае анатамічнае, пазнавальнае і практычнае значэнне. Яна была ацэнена выдатнай адзнакай і рэкамендавана да друку.

Яшчэ да Вялікай Айчыннай вайны У. А. Казак вучыўся на 5 курсе біяфака Вільнюскага універсітэта. Але вайна не дала магчымасці закончыць універсітэт. Згінулі і ўсе дакументы, якія сведчылі аб тым, што Уладзімір Антонавіч амаль што закончыў яго. Пацяклі гады працы, самаадукацыі—Уладзімір Антонавіч настаўнічаў. Але ўвесь час у гэтыя гады яго цягнула да вучобы, да сапраўднай навукі.

Вучоба—гэта праца і праца нялёгкая. У. А. Казак добра гэта ведаў. Пачынаючы з першага курса, ён настойліва працаваў, чытаў шмат кніг і дапаможнікаў. І ніколі не было выпадку, каб ён не здаў якога-небудзь экзамена.

Зараз высакароднае імкненне У. А. Казака ўвянчалася поспехам. Застаўся ж толькі адзін дзяржаўны экзамен! І ўсё ж Уладзімір Антонавіч хвалюецца. Застаюцца лічаныя дні—ён старанна рыхтуецца.

У гэтыя дні Уладзіміра Антонавіча можна ўбачыць у лабараторыях біякорпуса, у чытальнай залі. У яго добры, адкрыты твар, а пад пахай заўсёды ёсць некалькі кніжак.

У тым, што экзамен Уладзімір Антонавіч здасць паспяхова, няма ніякага сумнення. Хутка ён паедзе ў школу, да сваіх вучняў, дзе будзе працягваць сваю пачэсную работу выкладчыка.

М. БАНДАРЭНКА.

# Вынікі, якія не могуць задаволіць

МЕЛІСЯ УСЕ падставы чакаць, што студэнты І курса аддзялення рускай мовы і літаратуры пакажуць высокія веды па гісторыі КПСС на экзамене. У адрозненне ад мінулых год першакурснікі не выязджалі на сельскагаспадарчыя работы і таму для іх быў прачытаны поўнасцю, без скарачэнняў, курс лекцый, праведзены семінарскія заняткі. У самым пачатку вучэбнага года ў друку былі апублікаваны раздзелы новага падручніка па гісторыі КПСС, што значна палегчыла работу па вывучэнню курса. Акрамя таго, па матэрыялах XXI з'езда і па гісторыі КПБ на філфаку, як і на іншых факультэтах, праведзены невялікія спецкурсы. У кабінеце гісторыі КПСС перад экзаменамі сістэматычна праводзіліся кансультацыі.

Нажаль, прайшоўшыя экзамены па гісторыі КПСС на рускім і беларускім аддзяленнях філфака, прынеслі вельмі несуцяшальныя вынікі. На аддзяленні рускага языка і літаратуры з агульнай колькасці 49 чалавек выдатныя веды паказалі 3 студэнты, добрыя—19, здавальняючыя адзнакі атрымалі 18 чалавек, нездавальняючыя 7 і два студэнты на экзамен не з'явіліся. Не лепш і на беларускім аддзяленні: адзнаку «выдатна» атрымалі 9 студэнтаў, «добра»—20 студэнтаў, «здавальняюча»—15, «нездавальняюча»—5 і 4 чалавекі на экзамены не з'явіліся.

Перш за ўсё, здзіўляе вельмі вялікая колькасць нездавальняючых адзнак. Працуючы на працягу шэрагу апошніх гадоў на філалагічным, гістарычным і юрыдычным факультэтах, мне ўпершыню прыходзіцца сустракацца з такім фактам, калі 15 працэнтаў першакурснікаў атрымалі нездавальняючыя адзнакі. Пры гэтым у большасці з іх размова ідзе не аб якіх-небудзь выпадковых недапрацоўках або прабелах, а аб абсалютным няведанні элементарных пытанняў праграмы курса. Такія студэнты беларускага аддзялення, як Зенчык, Капыловіч, Шуст, рускага аддзялення Мельнікава, Рублеўская, Кобля, Даўнаровіч і іншыя не маглі сказаць нічога членараздзельнага ні па аднаму пытанню білета, а іх «адказы» на элементарныя дапаўняльныя пытанні між волі выклікалі ўсмешкі ў студэнтаў, якія сядзелі побач.

Не могуць задаволіць вынікі экзаменаў па гісторыі КПСС яшчэ і таму, што вельмі многа студэнтаў—каля 40 працэнтаў—атрымалі здавальняючыя адзнакі. Адказы гэтых студэнтаў на экзамене былі павярхоўныя, яны паказалі, што веды іх не глыбокія, у іх ёсць вельмі істотныя прабелы. Вельмі сумным і вельмі трывожным з'яўляецца той факт, што многія першакурснікі не вывучылі матэрыялаў XXI з'езда КПСС, не ведаюць, што адбываецца ў нашай краіне, у замежных. І гэта ў той жа час, калі ім быў прачытаны спецыяльны курс па XXI з'езду, калі амаль на кожным семінарскім занятку ўспаміналі аб тым, што трэба чытаць газеты, быць у курсе праходзячых у свеце падзей.

Якія ж прычыны прывялі да такіх вынікаў? На працягу года з боку студэнтаў не было прад'яўлена ніякіх прэтэнзій ні да чытаўшых лекцыйны курс, ні да вядучых семінарскія заняткі. І хаця зусім магчыма, што мелі месца якіясьці недахопы ў выкладанні, зусім відавочна, што галоўнае не ў гэтым. Нам, здаецца, асноўная прычына ў тым, што дэканат, партыйная і камсамольская арганізацыі факультэта мала займаліся пытаннямі арганізацыі і кантроля за самастойнай работай студэнтаў, а таксама не ўлічвалі тых абставін, што на першы курс у 1958 годзе прыйшлі ў асноўным людзі з вытворчасці. Ужо ў зімовую сесію многія студэнты І курса беларускага аддзялення не здалі залікаў па гісторыі КПСС, некаторыя пераздавалі яго па 2 і нават 3 разы, аднак гэта ні ў кога сур'ёзнай трывогі не выклікала. Нярэдка былі выпадкі, калі ўсе студэнты першай групы рускага аддзялення і першай групы беларускага аддзялення прыходзілі на семінарскія заняткі зусім непадрыхтаванымі, без канспектаў першакрыніц.

Нам здаецца, што ў сваёй большасці першы курс філфака па складу нядрэнны, аднак ён патрабуе да сябе больш пастаяннай увагі з боку дэканата і грамадскіх арганізацый. Ёсць усе падставы лічыць, што пры адпаведнай дапамозе, больш дакладным кантролю за самастойнай работай студэнтаў і больш сур'ёзных патрабаваннях да іх, на гэтым курсе можна дабіцца значна лепшых вынікаў.

В. СІКОРСКІ, дацэнт, кандыдат філасофскіх навук.



Так выглядае канспект па гісторыі КПСС С. Буткевіча. Таму і не дзіва, што на экзамен ён з'явіўся з кіпай шпаргалак.

